УДК 821.161.3

*Г.М. Праневіч*

# БІБЛІЯ ЯК ІНТЭРТЭКСТУАЛЬНАЕ ПОЛЕ Ў ТВОРАХ БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІХ РАМАНТЫКАЎ XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯЎ

У артыкуле даследуецца інтэртэкстуальнае поле Бібліі і яго ўплыў на змест і формы рамантычнага ўспрыняцця і асэнсавання нацыянальнай рэчаіснасці ў творах такіх пісьменнікаў XIX – пачатку XX ст., як А. Міцкевіч, Я. Баршчэўскі, К. Каліноўскі, Ф. Багушэвіч, Я. Купала, Я. Колас і інш.

Інтэртэкстуальнае поле Бібліі, яе ўплыў на развіццё і станаўленне ідэйнага зместу і эстэтыкі беларускага рамантызму XIX – пачатку XX ст. даследаваліся ў беларускім літаратуразнаўстве несістэмна, аказіянальна, што звужае магчымасці раскрыцця субстанцыянальных асноў беларускага рамантызму, высвятлення прычын і характару мастацкіх арыентацый і падключэнняў пісьменнікаў-рамантыкаў да зместу выдатнага помніка духоўнай культуры чалавецтва.

*Мэта* даследавання заключаецца ў раскрыцці на прыкладзе твораў беларуска-польскіх рамантыкаў інтэртэкстуальнага поля Бібліі, высвятленні ролі і месца яе традыцый у структуры рамантычнага метаду і рамантычнага кірунку ў беларускай літаратуры XIX – пачатку XX стст.

Як крыніца хрысціянскага веравучэння і помнік сусветнага значэння, Біблія ўвайшла ў духоўны свет усходняга славянства ў канцы X стагоддзя. Яна і сёння застаецца невычэрпнай крыніцай ідэй, вобразаў, сюжэтаў, матываў для ўсіх літаратур свету, у тым ліку для беларускай, якая з часоў хрышчэння Кіеўскай Русі і першых беларускіх святых Еўфрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага развівалася на магутным падмурку хрысціянскай культуры.

Вялікі Скарына, які ажыццявіў першы пераклад Бібліі на старабеларускую мову і выдаў друкам большую частку кніг Старога і Новага Запаветаў, бачыў у ёй «всее прироженое мудрости зачало и конець», захапляўся даступнасцю і, адначасна, глыбінёй зместу гэтай вялікай кнігі, якая, па яго словах, «младенцем и людем простым ест наука, учителом же и людем мудрым подивление. Яко река дивная мелка – по ней же агнець брести можеть, а глубока – слон убо пливати мусить» [12, с. 46]. У прадмове да «Кнігі Ісуса Сірахава» адзначаў, што «елико крат в ней будеши чести, по каждом чтении новаго нечто научишися, чего жь есь пред тым не умел, вся бо Саломонова і Арестотелева божественная и житейская мурость в сей книзе краткими словы замкнена ест» [ 12, с. 24].

Закладзеныя Ф. Скарынам і ягонымі паслядоўнікамі С. Будным і В. Цяпінскім традыцыі гуманістычна-асветніцкага асэнсавання Бібліі праз пераклады біблійных твораў на старабеларускую мову і каментаванне іх тэкстаў мелі вялікае значэнне для духоўна-культурнага прагрэсу беларускага народа, выпрацоўкі ў беларускай літаратуры патрыятычнай канцэпцыі асобы і ідэй незалежнай праваой дзяржавы, фарміравання гуманістычнай філасофіі нацыянальна-духоўнага быцця.

Маштабнасць і змястоўнасць Бібліі як аднаго з найбольш універсальных пратографаў сусветнай літаратуры практычна не паддаюцца нейкаму строгаму навуковаму акрэсленню і вымярэнню па прычыне татальнай прысутнасці традыцый помніка ў сусветным літаратурным працэсе. У той жа час інтэнсіўнасць звароту да біблійных сюжэтаў, тэм, вобразаў, матываў, характар рэцэпцыі, успрыняцця і трактоўкі яе сакральнага сэнсу і філасофскага зместу ніколі не складалі нейкай

пастаяннай велічыні. У розныя гісторыка-культурныя эпохі адносіны да Бібліі, шчыльнасць і шырыня яе інтэртэкстуальнага поля ў розных еўрапейскіх літаратурах (у тым ліку славянскіх) былі таксама неаднолькавымі. Так, напрыклад, еўрапейскае Сярэднявечча зрабіла Біблію сакральнай культавай кнігай, тады як Рэнесанс і Рэфармацыя знялі з яе покрыў святасці і зрабілі прадметам крытычнай чалавечай думкі і навуковых доследаў. Барока аднавіла веру ў яе правідэнцыяльны змест і эсхаталагічныя прароцтвы, а Асветніцтва спарадзіла атэістычны скепсіс у дачыненні да Бібліі як крыніцы рэлігійнага светапогляду. І толькі рамантызм (супярэчліва-разнастайны ў сваіх праявах, плынях, нацыянальных варыянтах і мадыфікацыях) зноў звярнуў увагу на яе сакральна-духоўны змест, знаходзячы ў біблійных тэкстах і вобразах водгук новаму разуменню сутнасці чалавека і каштоўнасцяў духоўнага існавання, сугучча ідэалам барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, адраджэнне і духоўны прагрэс паняволеных народаў.

Генезіс і вытокі еўрапейскага рамантызму яго даследчыкі зусім справядліва звязвалі з Сярэднявеччам, з рэлігійнай экзальтаванасцю і гераічнай пасіянарнасцю новых рамана-германскіх народаў, як італьянцы, французы, іспанцы, немцы, англічане, якія ўзніклі і самасцвердзіліся на руінах Рымскай імперыі. А саму рамантычную літаратуру атаясамлівалі з паэзіяй французскіх трубадураў, нямецкіх мінезінгераў і шатландскіх бардаў, з народнай паэзіяй, з жанрамі балады і раманса [7, с. 110–112].

А. Міцкевіч у сваім праграмным артыкуле «Пра рамантычную паэзію», які разам з першым томікам паэзіі «Балады і рамансы» (1822 г.), а таксама працай З. Даленгі-Хадакоўскага «Аб славяншчыне перад хрысціянствам» (1819 г.) выканалі ролю маніфеста рамантызму ў польскай, беларускай, украінскай, літоўскай літаратурах пачатку XIX ст., пісаў пра сярэднявечны рамантызм наступнае: «Новыя пачуцці і ўяўленні, уласцівыя самім варварам, так званы рыцарскі дух і звязаныя з ім павага і любоў да прыгожага полу, чужыя грэкам і рымлянам, строгае выкананне законаў гонару, рэлігійны экстаз, міфічныя паданні і ўяўленні варварскіх народаў, былых язычнікаў і нядаўніх хрысціян, змяшаныя ў адно, – вось тое, што складае сярэдневяковы рамантычны свет, паэзія якога таксама называецца рамантычнай» [7, с. 110 ].

У шырокім кантэксце дачыненняў паміж класічным рамантызмам XIX стагоддзя і Сярэднявеччам не заўсёды, аднак, належным чынам усведамлялася і ўсведамляецца роля і значэнне біблійнага чынніка як субстанцыянальна істотнага і вызначальнага ў генезісе рамантызму, у фарміраванні асноўных прынцыпаў рамантычнага спасціжэння чалавека і свету ў славянскіх літаратурах. Між тым, у структуры рамантызму і рамантычнага метаду традыцыям Бібліі і хрысталагічнай філасофіі належыць адно з самых выдатных месцаў. Адзначым найперш той факт, што менавіта Бібліі (і ў першую чаргу евангелічнай трактоўцы вобраза Хрыста і ягонага вучэння) абавязаны рамантызм адкрыццю **духоўнага ўсёчалавека.** Чалавека пазамежавага, адкрытага вечнасці і Богу, большага са самога сябе, за сваю канкрэтную сямейна-родавую і сацыяльна-побытавую інсталяцыю, здольнага выйсці за межы сацыяльна-гістарычнай дэтэрмінаванасці ў часе і жыццёвай прасторы. Чалавека, які насуперак неспрыяльнай рэчаіснасці і абставінам адкрыў і спазнаў для сябе магчымасць працяглага існавання ў прасторы духоўнага ідэала.

Прыгадаем, што менавіта Хрыстос першы адкрыў для чалавецтва свет высокага і чыстага духоўнага жыцця, заснаванага на прынцыпах усеагульнай любові, дабра, красы і ісціны, супрацьпаставіўшы іх бруду зямной карыслівасці і эгаізму, адпрэчыўшы крывадушша і гвалт над людскім сумленнем і свабодай. Агульначалавечае значэнне ягонага вучэння заключаецца ў тым, што ідэалы дасканалага духоўнага жыцця і маралі ён паставіў вышэй за покліч крыві, знатнасць паходжання і роду, вывеў іх за межы

нацыянальнай выключнасці і рэлігійных догмаў іўдаізму і язычніцкіх рэлігій. І праз гэта стаў Сынам Чалавечым, гэта значыць сынам усяго чалавецтва.

Містычнаму ўзнясенню Хрыста на неба і яго наступнаму Боскаму ўвасабленню, пра што сведчаць усе чатыры Евангеллі Новага Запавета, цалкам адпавядае сэнс здзейсненага ім на зямлі. «Уладаранне маё не ад свету гэтага», – вучыў і сцвярджаў Хрыстос у адказ на абвінавачванні і нападкі фарысеяў. Французскі мысліцель Э. Рэнан пісаў з гэтай нагоды пра Хрыста, што «ён стварыў неба чыстых душ, дзе знаходзіцца тое, чаго дарэмна шукаюць на зямлі, – найдасканалейшае высакародства дзяцей Божых, поўная святасць, поўнае адмаўленне ад мірскога бруду, нарэшце, свабода, якую рэальнае грамадства выключае як нешта недасягальнае… Ён першы абвясціў царства духу» [11, с. 208].

Такім чынам, Біблія – кніга, якая засведчыла смерць старазапаветнага (грахоўнага) Адама і нараджэнне новага (духоўнага) першачалавека – Хрыста, – ва ўсе часы давала рамантыкам дасканалы прыклад самаахвярнай барацьбы і змагання за духоўнае адраджэнне чалавека і паняволеных народаў, перабудову свету на пачатках духоўнай свабоды, усеагульнай любові, роўнасці і справядлівасці як сістэмы актуальных агульначалавечых духоўна-культурных і маральна-этычных каштоўнасцяў. Невыпадкова, што ідэйнае багацце і паэтыка біблійных кніг, сюжэты Старога і Новага Запаветаў аб стварэнні свету і Эдэме, сусветным патопе, вобразы Божай Маці, Хрыста і ягоных апосталаў былі шырока запатрабаваны рамантычнай літаратурай XIX–XX ст., аказалі значны ўплыў на фарміраванне ідэалогіі, этыкі і эстэтыкі беларускага нацыянальна-вызваленчага і адраджэнскага руху.

Сярод найбольш распаўсюджаных формаў і спосабаў выяўлення біблійнага інтэртэкстуальнага поля ў творах беларуска-польскіх рамантыкаў можна вылучыць найперш рэмінісцэнцыі, алюзіі, алегорыі, кантамінацыі, зварот да персанажаў і герояў біблійнай гісторыі – Майсея, Іова і Ноя, евангелічных вобразаў Хрыста-Месіі, Дзевы Марыі, Юды; жанчыны «ў сонцы і месяцы» і Вавілонскай Распусніцы з «Апавешчання Яна Багаслова» і інш., на падставе чаго адбывалася крэацыя рамантычных тэкстаў.

Так, прыпадабненне паэта-творцы да Хрыста-Месіі стала, як вядома, адной з падвалін Міцкевічавага паэтычнага месіянізму і правадырства паэта ў нацыянальна-вызваленчым руху і духоўным адраджэнні народаў Рэчы Паспалітай (Польшчы), і найперш ягонай улюбёнай Літвы. Хрыстом народаў, які церпіць пакуты за ўсё чалавецтва, А. Міцкевіч успрымаў не толькі раскрыжаваную трыма падзеламі Рэч Паспалітую, але і паэта, які пакутуе за мільёны заняволеных, за народ і «забраную» айчыну. Прынамсі, аб гэтым сведчыць маналог Конрада у “Імправізацыі” А. Міцкевіча з 3-й часткі віленска-ковенскіх «Дзядоў»:

Teraz duszą jam w moję ojczyznę wcielony;
Ciałem połknąłem jej duszę,
Ja i ojczyzna to jedno.
Nazywam się Milion – bo za miliony
Kocham i cierpię katusze [8, s. 182].

Любоў паэта да свайго народа і спакутаванай радзімы ўсеабдымная, бязмежная ў часе і прасторы. У «Імправізацыі» мы назіраем выхад паэта за межы прыватнага, канкрэтна-гістарычнага індывідуальнага «я» ва ўніверсум нацыянальнай і сусветнай гісторыі і нават прымерванне рамантычнага героя А. Міцкевіча да Боскага абсалюту, што цяжка ўявіць сабе па-за зваротам аўтара да касмапалітычнага ўніверсуму Бібліі і духоўнага прыкладу Хрыста. Аднак універсалізм хрысціянскай ідэі ўсеагульнай любові відочна падпарадкаваны і служыць тут найперш патрыятычнай ідэі, мае выразнае нацыянальнае ўвасабленне.

Ale ta miłość moja na świecie,
Ta miłość nie na jednym spoczęła człowieku
Jak owad na róży kwiecie:
Nie na jednej rodzinie, nie na jednym wieku.
Ja kocham cały naród! – objąłem w ramiona
Wszystkie przeszłe i przyszłe jego pokolenia,
Przycisnąłem tu do łona
Jak przyjaciel, kochanek, małżonek, jak ojciec... [8, s. 176–177].

Больш за тое, у «Імправізацыі» паэт-творца ўздымаецца да палемікі і нават бунту супраць Бога-Айца, абапіраючыся менавіта на евангелічную постаць Хрыста – Бога-Чалавека. У трыадзінстве Бога-Айца, Бога-Сына і Святога Духа аўтар прызнае за Богам-Айцом розум і мудрасць Стваральніка, а за паэтам – яшчэ і пачуццё, душу, спачуванне і любоў да бліжняга, каштоўнасць якіх сцвердзіў паміж людзей сваім жыццём, смерцю і духоўным узнясеннем Хрыстос.

Kłamca, kto Ciebie nazywał miłoscią,
Ty jesteś tylko mądrością.
Ludzie myślą, nie sercem, Twych dróg sie dowiedzą
Myślą, nie sercem, składy broni Twej wyśledzą ...
<...>
Myślą oddałeś świata użycie,
Serca zostawiasz na wiecznej pokucie,
Dałeś mnie najkrótsze życie
I najmocniejsze uczucie [8, s. 177–178].

Свае (хрысціянскія паводле генезісу) перакананні аб перавазе сэрца і пачуцця ў адвечным канфлікце паміж сэрцам і розумам, паміж духоўнай сутнасцю і рацыяналістычна-матэрыялістычным досведам жыцця паэт сцвердзіў у баладзе «Рамантычнасць», якая вызначыла аснову Міцкевічавай рамантычнай філасофіі і эстэтыкі ўспрыняцця свету. Рацыяналістычным аргументам вучонага старца-няверы, які адмаўляе існаванне невідочнага свету, лірычны герой балады проціпастаўляе жыццё духу і сэрца.

Czucie i wiara silniej mówi do mnie
Niż mędrca szkiełko i oko.

«Martwe znasz prawdy, nieznane dla ludu,
Widzisz świat w proszku, w każdej gwiazd iskierce.
Nie znasz prawd żywych, nie obaczysz cudu!
Miej serce i patrzaj w serce!» [9, s. 31].

«Літоўскія пісьменнікі, – тлумачыў А. Міцкевіч у сваіх парыжскіх лекцыях сутнасць эстэтычнай праграмы краёвых рамантыкаў, – цэнтрам дзеяння робяць свет духаў, а свет відочны і людзей трактуюць як прыладу» [10, s. 374–375]. М. Яніён зусім справядліва пісала з гэтай нагоды, што літоўская школа рамантыкаў «першая ўвяла ў літаратуру свет духаў. Гэта яе характэрная рыса. Ніхто не адмаўляў гэтага свету, але ўжо была аддадзена забыццю хрысціянская філасофія, і паэты перасталі цікавіцца гэтым светам» [13, s. 31]. Беларуска-польскія рамантыкі, такім чынам, відочна аднаўлялі ў сваёй творчасці сувязь з сярэднявечнай філасофіяй, угрунтаванай на хрысціянска-евангелічным падложжы, на прынцыпах ідэалістычнага светаразумення. Філасофія польскага рамантызму, дадае М. Яніён, «змацоўвала космас адвечнай гармоніяй, згодай і адзінствам, паўсюль адкрывала шчыльныя сувязі-адпаведнікі, якія злучалі свет невідочны з відочным, матэрыю з духам, зямлю з небам» [13, s. 30]. Паводле гэтага прынцыпу ў творах беларуска-польскіх рамантыкаў сюжэты біблійнай гісторыі, свет

біблійных прароцтваў арганічна і натуральна спалучаліся з рэальнай сацыяльна-палітычнай гісторыяй царстваў, людзей і народаў. Пры гэтым апошняя знаходзіла ў першай свой натуральны выток, сваё адлюстраванне і тлумачэнне. Рамантычны месіянізм, зазначае польская даследчыца, грунтуецца на тым, «што чалавечая гісторыя капіруе ход свяшчэннай гісторыі. У ім фігуральная тоеснасць Польшчы і Хрыста ў справе выкуплення свету, польскі народ прызнаецца бязвіннай ахвярай, чые пакуты і ўваскрэсенне адкрыюць эру свабоды ў гісторыі чалавецтва. Тое, што адбылося з Польшчай у гістарычным плане можа быць, згодна з месіянскай канцэпцыяй, зразумета толькі праз зварот да надгістарычнага плана. Польскі месіянізм бясспрэчна быў спробай выйсці за рамкі гісторыі» [13, s. 31].

Такім чынам, Біблія, яе тэмы, матывы і вобразы, як пра тое сведчыць найперш творчы вопыт А. Міцкевіча, адкрывалі перад беларускімі і польскімі рамантыкамі шырокі прастор для пошуку аналогій, супадзенняў, супастаўленняў, алюзій, прамых і ўскосных рэмінісцэнцый, звязаных з патрэбамі вызваленчага руху і нацыянальна-духоўнага адраджэння.

Так, напрыклад, абгрунтоўваючы правы беларусаў на свабоду і ўласную веру, К. Каліноўскі звяртаўся ў «Мужыцкай праўдзе» да вобраза Хрыста, які прыняў пакуты за ўсё чалавецтва: «Калі сын боскі, прыйшоўшы на гэты свет, устанавіў праўдзівую веру і за гэту веру цярпеў крыжовыя мукі, то не для таго, каб якіясь там цары маскоўскія, байстручага роду, перамянялі закон божы, а мы, на прыказ гэтых цароў, выракаліся веры сваіх дзядоў і прадзедаў» [3, с. 137]. Вобраз Хрыста прысутнічае ў якасці алюзіі і ў адрасаваным беларускаму народу перадсмяротным развітальным «Пісьме з-пад шыбеніцы», якое ён завяршае вершам «Марыська чарнаброва, галубка мая…». У ім адкупіцелем за пакуты і нябесную кару, што зазналі паўстанцы, паўстае як сам герой-аўтар, так і ўвесь народ, на якога паэт ускладае адкупіцельную Хрыстову місію:

Калі за нашу праўду бог нас стаў караці
Ды ў прадвечнага суду вялеў прападаці,
То мы прападзем марна, но праўды не кінем,
Хутчэй неба і шчасце, як праўду, абмінем!

Не наракай, народзе, на сваю бяздолю,
А прымі цяжкую кару – прадвечнага волю.
А калі мяне ўспомніш, шчыра памаліся,
То я з таго свету табе адзавуся [3, с. 141].

У часы рамантызму і нацыянальна-вызваленчых паўстанняў ідэйнае багацце і паэтыка біблійных кніг аказалі значны ўплыў на фарміраванне ідэалогіі, этыкі і эстэтыкі нацыянальна-вызваленчага і адраджэнскага руху. Сюжэты Старога і Новага Запаветаў аб стварэнні свету і Эдэме, сусветным патопе, вобразы Божай Маці, Хрыста і ягоных апосталаў былі шырока запатрабаваны літаратурай XIX–XX ст. у мэтах адлюстравання новага гістарычнага і грамадска-палітычнага этапу ў жыцці беларускага народа.

Для Ф. Багушэвіча, напрыклад, вядомыя дзесяць наказаў, дадзеных Майсею на гары Сінай (кніга «Зыход»), сталі падставай для стварэння ў вершы «Ахвяра» своеасаблівага маральна-этычнага кодэкса жыцця і паводзін беларуса – чалавека і грамадзяніна, узорнага сем'яніна і змагара за айчыну, прыхільніка ідэй сацыяльнай справядлівасці, братэрства і роўнасці людзей.

Маліся ж, бабулька, да Бога,
Каб я панам ніколі не быў,
Не жадаў бы ніколі чужога,
Сваё дзела як трэба рабіў.

<…>
Чужых жон каб не вёў да граху,
А сваю каб як трэба любіў,
Каб мне дзеці былі ў слуху,
Каб я бацькам для іх век дажыў.
Каб людзей прызнаваў за братоў,
А багацтва сваё меў за іх,
Каб за край быў умёрці гатоў,
Каб не прагнуў айчызны чужых [2, с. 77–78].

Асабліва плённым быў зварот да біблійнай спадчыны класікаў нацыянальнай літаратуры, якія ў абліччах біблійнага Хрыста і ягоных пракрокаў убачылі высокі і трагічны вобраз народа і народных будзіцеляў, герояў вызваленчага руху і самаахвярных носьбітаў адраджэнскай ідэі. А. Міцкевіч, напрыклад, у сваіх творах атаясамліваў лёс народаў Рэчы Паспалітай пасля трох падзелаў дзяржавы з біблійным вобразам укрыжаванага Хрыста. Пра цярністы шлях прарока ў сваёй айчыне, боязь і недавер людзей да новых ісцін расказаў Я. Купала ў вершы «Прарок».

Сярод маны, сярод насмешкаў,
Знак нейкі тулячы к грудзям,
Ішоў прарок пясчанай сцежкай
З навукай новаю к людзям.
<…>
А людзі, глянуўшы на сонца,
Адказ казалі грамадой:
– Па колькі ж нам дасі чырвонцаў,
Калі мы пойдзем за табой? [5, с. 83–85].

Носьбітам адраджэнскай ідэі, абаронцам духоўнасці і красы роднай песні выступае Хрыстос у апавяданні М. Багдановіча «Апокрыф». З трагедыяй народа ў Першую сусветную вайну і драмай уласнага лёсу цесна звязаны таксама зварот паэта да тэмы сусветнага патопу ў вершы-баладзе «Страцім-лебедзь». Магутны змагарны птах-тытан адмаўляецца ратавацца ў Ноевым каўчэгу і пасіўна назіраць за гібеллю свету, але пад цяжарам насеўшых на яго дробных птушак гіне ў няроўным змаганні з марской стыхіяй.

Пачынаў тут Ной будаваць каўчэг
З таго дзерава ліванскага.
Ўшыркі гэтаму каўчэгу – сто лакцёў,
А ўдаўжкі – болей тысячы.
Ды ўзяў туды Ной і птах і звяроў,
Каб не звёўся іх род з зямлі.
Ды не плыў к яму з мора сіняга
Страцім-лебедзь – горды, моцны птах [1, с. 316].

Біблійныя творы жывілі і падпітвалі розныя жанры, стылі, напрамкі нацыянальнай літаратуры, адказвалі на яе мастацкія запатрабаванні і ідэйныя пошукі. Так, Я. Купала, малюючы вобразы двух закаханых у рамантычнай паэме «Яна і я», несумненна, натхняўся вобразамі біблійнага Эдэма – райскага саду, які даў прытулак першым людзям на зямлі – Адаму і Еве.

Раем на зямлі выглядываў нам сад,
Я ў ім – Адам, яна ў ім – Ева;
У раі гэтым вецер быў нам бог і сват,
Вяцьвямі шлюб давала дрэва [6, с. 117].

Адчуваецца ў паэме і ўплыў «Найвышэйшай песні Саламонавай», якая ўражвае мастацкім апісаннем па-язычніцку палкага пачуццёвага кахання цара Саламона і Суламіты, што «як смерць – моцнае» і як «полымя – непагаснае».

Мілая! О, колькі радасці даеш
Майму ты сэрцу маладому!
Нават ты сама таго не спазнаеш,
Які ты скарб у маім дому!

Мілая! Сагрэй мяне сваймі грудзьмі!
К маім грудзям прыліпні шчыра;
Богамі хай станем мы паміж людзьмі,
Нябеснага князямі міру! [6, с. 117].

Даследчыкі літаратуры (У. Конан) зусім справядліва гавораць таксама аб уплыве прароцтваў Іаана Багаслова аб «новым небе і новай зямлі» на вобраз і запавет «новай зямлі» ў Коласавай эпапеі, у якой выявілася адвечнае памкненне герояў да зямлі-радзімы як своеасаблівага сялянскага раю, правобраза царства Божага на зямлі, дзе «сьмерці ня будзе ўжо; ні плачу, ні енку, ні хваробы ўжо не будзе; бо ранейшае прайшло». Прыкладна ў такім жа ключы вытрыманы ў паэме і запавет «новай зямлі», які Міхал пакідае перад смерцю свайму брату Антосю:

Зямля... зямля.. туды, туды, брат,
Будуй яе... ты дай ёй выгляд...
На новы лад, каб жыць нанова... [4, с. 280].

Нялішне будзе заўважыць, што сам вобраз Міхала як бы ўяўляе ў паэме своеасаблівую мастацкую кантамінацыю біблійнага цярпліўца Іова і свіфтаўскага волата-асілка Гулівера, аблытанага і спавітага тысячамі тонкіх ніцей сацыяльнага прыгнёту і рабства, разарваць якія яму не па сілах.

Такім чынам, Біблія, яе вобразы і традыцыі склалі магутнае інтэртэкстуальнае поле ў беларускім рамантызме, адыгралі выключна важную ролю ў фарміраванні ідэалогіі, эстэтыкі і этыкі нацыянальна-вызваленчага і адраджэнскага руху, станаўленні ў беларускім рамантызме XIX – пачатку XX ст. вобраза радзімы. Найбольш актыўна і поўна інтэртэкстуальнае поле Бібліі ў творах беларуска-польскіх рамантыкаў праявілася ў такіх аўтарскіх прыёмах і структурных кампанентах паэтыкі рамантызму, як рэмінісцэнцыі, алюзіі, аўтарскія адсылкі і звароты да вобразаў біблійных герояў, стылізацыя біблійных тэкстаў, прамыя і ўскосныя цытаты, запазычванне і пераасэнсаванне сюжэтаў, капіраванне мастацкіх кодаў і стылёвых парадыгмаў, выкарыстанне вобразных клішэ, біблійных афарызмаў і крылатых выразаў, перайманні ролевых функцый вобразаў і інш.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М.Багдановіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 752 с.
2. Багушэвіч, Ф. Творы : вершы, паэма, апавяданні, артыкулы, лісты / Ф. Багушэвіч. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 309 с.
3. Каліноўскі, К. Мужыцкая праўда / К. Каліноўскі // Маладосць. – 1988. – № 1. – С. 134–142.
4. Колас, Я. Збор твораў : у 14 т. / Я. Колас. – Мінск : Маст. літ., 1974. – Т. 6: Паэмы «Новая зямля» і «Сымон-музыка». – 624 с.
5. Купала, Я. Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала. – Мінск : Маст. літ., 1997. – Т. 3 : Вершы, пераклады 1911–1914. – 342 с.

6. Купала, Я. Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала. – Мінск : Маст. літ., 1995. – Т. 6 : Паэмы, пераклады. – 1999. – 430 с.
7. Міцкевіч, А. Выбраныя творы / А. Міцкевіч. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2003. – 640 с.
8. Mickiewicz, A. Dzieła poetyckie : w 4 t. / A. Mickiewicz. – Warszawa : Czytelnik, 1998. – T. 3 : Dziady. – 348 s.
9. Mickiewicz, A. Dzieła poetyckie : w 4 t. / A. Mickiewicz. – Warszawa : Czytelnik, 1998. – T. 1 : Wiersze. – 348 s.
10. Mickiewicz, A. Dzieła : w 10 t. / A. Mickiewicz. – Warszawa : Czytelnik, 1998. – T. X. – 348 s.
11. Ренан, Э. Жизнь Иисуса. Апостолы / Э. Ренан ; пер. с фр. Е.В. Святловского. – Минск : Беларусь, 1991. – 494 с.
12. Скарына, Ф. Творы : прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія / Ф. Скарына. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 207 с.
13. Янион, М. Польский романтизм в европейском романтизме / М. Янион // Польский романтизм и восточнославянские литературы. – Москва : Наука, 1973. – 224 с.

***Pranevich H.M.*** **The Bible and its Intertextual Field in Literary Works of Belarusian and Polish Romanticists of the XIXth and the Beginning of the XXth Centuries**

In the article an intertextual field of the Bible and its influence on the form and content of romantic perception and comprehension of a national reality in the literary works of such writers of the XIXth and the beginning of the XXth centuries as A. Mitskevich, Y. Barshcheuski, K. Kalinouski, F. Bagushevich, Y. Kupala, Y. Kolas and others is examined.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 23.03.2010